

## Куды звяртацца?

Працу трэба дасылаць у адным асобніку да 1 лістапада 2007 г. (дата вызначаецца па паштовым штэмпелі) на адрас: **«Блізкая гісторыя», а/с 128, 220064, Мінск**
Электронны адрас: **historyja@belinter. net**

Усю патрэбную інфармацыю, парады і брашуру, у якой падрабязна выкладзены ўмовы конкурсу, можна атрымаць ад сакратара конкурсу Ірыны Коваль
па тэлефонах:
+37517 213-60-87,
+37529 3174625 (Velcom),
+37529 5056385 (МТС)
па эл. пошце: historyja@belinter. net
па пошце: «Блізкая гісторыя», а/с 128, 220064, г. Мінск

***Жадаем поспехаў!***



## АНКЕТА ЎДЗЕЛЬНІКА КОНКУРСУ

| **Анкета ўдзельніка конкурсу (можа быць ксеракапіравана альбо разборліва перапісана ад рукі)** | тут не запаўняць |
|---|---|
| **Назва працы:** | |
| **Форма працы** (колькасць элементаў: старонак тэксту, фотаздымкаў, малюнкаў, аўдыё -, відэакасет і інш.): | |
| **Аўтар працы** (калі праца калектыўная, дадзеныя падаюцца на кожнага аўтара)<br>Імя__________<br>Прозвішча__________<br>Тэлефон__________<br>Дата нараджэння__________<br>Адрас. *(індэкс)*<br>__________<br>Іншыя спосабы сувязі (калі маюцца fax, e-mail)<br>__________ | |
| Школа (вучэльня)<br>(№ , назва, адрас, тэлефон, факс, e-mail)<br>Клас | |
| Ці прымалі ўдзел у папярэдніх конкурсах праекта «БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ» ________ | |
| **Куратар працы** (калі ён ёсць):<br>Імя<br>Прозвішча<br>Тэлефон<br>Адрас (па жаданні)<br>Прафесія | |
| У чым заключалася дапамога куратара | |
| Як атрымалі інфармацыю пра конкурс | |

**БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ**



# ГІСТОРЫЯ ВАЧЫМА ХАТНЯГА ФАТОГРАФА

**Даследчы конкурс па гісторыі для школьнікаў Беларусі**

**2007**



Фатаграфічны спосаб адлюстравання рэчаіснасці вынайшлі ў XIX стагоддзі, але менавіта ў XX фатаграфія стала паўсядзённай рэччу, даступнаю амаль кожнаму.

Цяпер мільёны фотаздымкаў жоўкнуць у старых альбомах, у скрынях, на гарышчах… У іх адлюстравана жывая гісторыя. Гэта гісторыя асобы, сям'і, мясцовасці. Але блізкі свет, убачаны праз шкельца фатаграфічнай камеры, — гэта часцінка вялікага сусвету людзей. Лёс чалавека, ягонай сям'і, адбіты праз аб'ектыў хатняга фатографа, дапамагае ўбачыць яскравы і невядомы вобраз нашай агульнай гісторыі.



## Што мы прапануем?

Паспрабуйце аднавіць частку вашай «блізкай гісторыі» — вашай гісторыі сям'і, знаёмых, роднага гораду альбо вёскі, узяўшы за асноўную крыніцу здымкі з вашага хатняга альбома. Гэта можа быць адна падзея, але важная для тых, хто на здымку ці для вас саміх, а можа быць гістарычны нарыс пра некалькі пакаленняў. Галоўнае тое, што падставаю для вашай гісторыі павінны быць фатаздымак ці некалькі здымкаў. Таксама важна, каб, ствараючы сваю «малую гісторыю», вы не забываліся пра «вялікую гісторыю» — прыватная аповесць набывае дадатковы сэнс і становіцца больш зразумелаю на фоне падзеяў у краіне і ў свеце, а гістарычныя падзеі лепш можна зразумець праз лёсы і пачуцці асобных людзей.

## Што трэба зрабіць?

Пашукайце ў сямейных альбомах, прагледзіце здымкі вашых бацькоў, дзядоў, а можа, і вашыя ўласныя, з мінулых гадоў. Мы ўпэўненыя, што вы знойдзеце нямала цікавых момантаў, выпадкаў, гісторый, а магчыма перад вамі паўстануць розныя пытанні і загадкі. Адбярыце тое, што, на ваш погляд, можа быць падставаю для самага цікавага і важнага аповеду. Гістарычны перыяд — ад пачатку XX стагоддзя па сёняшні дзень.

Цяпер паспрабуйце скласці апавяданне, адказаць на пытанні. Уважліва пачытайце надпісы на здымках і ў альбомах. Распытайце родных і знаёмых, пагартайце старыя лісты і дзённікі, калі трэба, зазірніце ў газеты і часопісы адпаведных часоў, якія можна знайсці ў бібліятэках.

Паступова ваша гісторыя будзе гатовая. Калі вы адчуваеце, што яна робіцца цікаваю не толькі асабіста вам ці «героям» вашых здымкаў, значыць атрымліваецца тое, што трэба — гісторыя «вачыма хатняга фатографа».



## Як напісаць працу?

Пажаданы аб'ём працы — ад 3 да 10 старонак на пішучай машынцы ці на камп'ютэры. Абавязкова павінны быць тыя здымкі, на падставе якіх робіцца праца. Добра, калі ілюстрацыяў шмат, але памятайце, малюнкі не заменяць тэксту, вашых уласных думак і меркаванняў. У працу не ўкладайце арыгінальных здымкаў, зрабіце копіі на ксераксе ці праз сканер. Можна зрабіць усю працу ў электронным варыянце і даслаць па электроннай пошце. Пракансультуйцеся з настаўнікам гісторыі, кіраўніком гістарычнага (альбо фота-) гуртка, можа з вашымі бацькамі, старэйшымі сваякамі — як лепш напісаць працу, якія матэрыялы скарыстаць, якія падзеі могуць быць найбольш важнымі. Старэйшы памочнік можа быць куратарам вашай працы. Можна зрабіць працу калектыўна — з сябрамі ці калегамі па гуртку.

**Гэта важна:** акуратна пазначце свае каардынаты — імя і прозвішча, узрост, адрас, навучальную ўстанову. Абавязкова запоўніце анкету ўдзельніка конкурсу, якая дадаецца да гэтага буклета, яе трэба прыкласці да працы.

У конкурсе могуць браць удзел вучні сярэдніх навучальных установаў (пачынаючы з 7-га класа) — школ, ліцэяў, гімназій, а таксама навучэнцы каледжаў, ПТВ, тэхнікумаў (да 19 год).

*Вынікі конкурсу будуць абвешчаныя 29 снежня 2007 г.*